Жыве Беларусь!

ПРУЖАНСКАЕ ВЕЧА

№ 1 Незалежная грамадска-палітычная газета Пружаншчыны жнівень 1993 г.

ПРАЦЯГ ВЯКОЎ

На белай кашулі чырвоны пісяг
Ад злосці надступнага меча.
Бел-чырвона-белы балючы сьцяг
Склікае на смутнае веча.

На веча.
Дзе ў вечнасці мусім спытаць.
Ці нам заставацца народам.
Ці толькі аб'едкі надзеі спытаць
І моўкнуць. і глыбіцца ў одум.

Ці нам у агульным застоллі людзей
Паблізу ля покуця сесьці.
Ці ціха чакаць, каб які дабрадзей
Наш хлеб не пярэчыў нам есьці.

Узьвіўся, як крык, на крыжацкіх касьцях
І погань кіруе ў прадонне.
Бел-чырвона-белы крывіцкі сьцяг
У вечным памкненні Пагоні!

Рыгор Барадулін.

Шаноўнае спадарства!

Вы трымаеце першы нумар незалежнай грамадска-палітычнай газеты Пружаншчыны.

Як глыбока перакананы яе заснавальнікі, неабходнасць такога выдання відавочная, бо амаль увесь рэспубліканскі друк (газеты «Рэспубліка», «Семь дней», «Советская Белоруссия», «Знамя юности», «Белорусская нива») знаходзяцца на ўтрыманні і пад кантролем пракамуністычнага ўрада Кебіча. А нядаўна мясцовыя ўлады па ўказцы гэтага ж урада прыбралі да сваіх рук раённыя газеты. Такі ж лёс напаткаў і нашы «Раённыя будні», якія займелі грыф «Орган Пружанскага раённага Савета народных дэпутатаў». Карацей кажучы, зноў ідзе захоп друку ачуняўшымі ад першачарговай разгубленасці бальшавіцкімі структурамі. За грошы падаткаплацельшчыкаў, за нашы з вамі грошы яны заказваюць сваю палітычную музыку у газетах, на радыё і тэлебачанні. Дык хіба можна пры такіх умовах атрымліваць аб'ектыўную інфармацыю?

А цяпер, якой бачыцца наша газета, якія публікацыі будуць вызначаць яе накірунак і адметнасць?

Перш за ўсё ставіцца на мэце асвятленне найбольш хвалюючых грамадскасць пытанняў узаемаадносін паміж жыхарствам раёна і мясцовай камуністычнай уладай. Газета будзе рашуча выступаць у абарону правоў і годнасці беларускага народа, паказваць сапраўднае аблічча тых, хто для ўласнага дабрабыту гандлюе незалежнасцю Беларусі. Наша выданне будзе садзейнічаць наладженню кантактаў паміж людзьмі дэмакратычных поглядаў, што не прымаюць антычалавечай бальшавіцкай ідэалогіі. На старонках газеты будуць асвятляцца пытанні беларускага нацыянальнага адраджэння, культурнага жыцця і гісторыі роднага краю.

Свой першы нумар мы выдалі на сродкі ініцыятараў.

Мы спадзяемся, што з вашай дапамогай, шаноўныя чытачы, мы зможам хоць адзін раз у месяц выдаваць газету.

Рэдкалегія.

Коратка аб усім

Як стала вядома, расейскія вайсковыя часткі выводзяцца з ракетных баз, што каля Ружан, Шарашова і Купліно. І дзякуй Богу. Але па распараджэнні старшыні Саўміна Кебіча іх тэрыторыя з забудовамі перадаецца Міністэрству ўнутраных спраў пад турмы. Тры турмы на адзін раён — ці не занадта? Прамаўчым?

✦ ✦ ✦

Толькі на другой сесіі і то ў паўторным галасаванні з перавагай усяго ў адзін голас быў дадзен дазвол прыцягнуць да крымінальнай адказнасці дэпутата-дырэктара маслазавода Семянчука С. Д. за махлярства маслам. Дэпутаты-наменклатуршчыкі самааддана ратавалі свайго таварыша.

✦ ✦ ✦

Пасля праверкі радыёзавода Галоўным упраўленнем эканамічнага Кантролю па Брэсцкай вобласці дырэктар Чурбанаў Я. У. зняты са свае пасады. Не дапамаглі хітрыкі з рабочымі -падхалімамі, якія ездзілі ў Менск ратаваць свайго гаспадара.

✦ ✦ ✦

На адну скульптуру Леніна ў нашым раёне паменшала. «Правадыр сусветнага пралетарыяту», што стаяў ля школы № 3 ў Пружанах, нядаўна разбіты і вывезены на Пясчыну па прычыне адсутнасці пальцаў на правай руцэ.

✦ ✦ ✦

У жніўні праводзіцца ў Пружанах гэтак званая «выездная» сесія абласнога Савета. Вось чаму ў нашым горадзе спешна беляць і пудраць, латаюць дзіркі, зразумела, у цэнтры горада, пачынаючы з Дома Саветаў. Паказуха ёсць паказуха. Старая бальшавіцкая ўлада па-новаму — у інтарэсах і на карысць людзей працаваць не можа і не хоча.

✦ ✦ ✦

Дырэктар саўгаса «Кавалі» Зінчанка, асляплены бальшавіцкай класавай барацьбой, на сесіі раённага Савета марна патрабаваў выдаліць з залы паседжанняў запрошанага туды народнага дэпутата гарадскога Савета ад БНФ Сароку Генадзя.

✦ ✦ ✦

Бедная Савецкая ўлада.! За усе гады свайго панавання так і не змагла падрыхтаваць для Пружанскага раёна спецыяліста па ахове прыроды. З-за адсутнасці такога гэту пасаду цяпер займае былы першы сакратар райкама КПБ Разанка Г. Г. з дыпломам інжынера-механіка.

✦ ✦ ✦

І-га ліпеня б. г. на сесіі Вярхоўнага Савета камуністычная большасць парламента (аб'яднанне «Беларусь») спрабавала адхіліць ад улады Старшыню ВС Шушкевіча Станіслава толькі за тое, што ён выказаўся супраць уцягвання Беларусі ў гэтак званую калектыўную бяспеку і прапанаваў гэта пытанне вынесці на рэферэндум. Выступленні на сесіі працўнікаў Шушкевіча былі, як правіла, нетактоўныя, абразлівыя, грубыя. Дзякуючы падтрымцы апазіцыі БНФ Старшыня быў ўратаваны.

З усіх канцоў Беларусі ідуць тэлеграмы і пісьмы Старшыні Вярхоўнага Савета Шушкевічу Станіславу, у якіх выказваецца яму падтрымка.

✦ ✦ ✦

Беларусы — самая раскіданая па свеце нацыя, каля 4-х мільёнаў якой жыве па-за межамі Бацькаўшчыны.

✦ ✦ ✦

8—10 ліпеня праходзіў першы з'езд беларусаў свету. У Менск з'ехалася 900 дэлегатаў — беларусаў з блізкага і далёкага замежжа. Сярод іх была і выступіла на з'ездзе Раіса Жук-Грышкевіч, ураджэнка Пружан (дзявочае прозвішча Жукоўская), якая жыве ў канадскім горадзе Таронта.

✦ ✦ ✦

Шаноўныя дырэктары, старшыні, начальнікі! Звярніце ўвагу на свае канторы. Пагладзіце, што вісіць на сценах. Вы там амаль паўсюдна знойдзеце рэшткі былой так званай прапаганды і агітацыі. Гэта і партрэты правадыроў неіснуючай дзяржавы, і замшэлыя лозунгі, і многае іншае. У калідоры, напрыклад, лясгаса і сёння вісіць сценгазета ў такім аздабленні: «Решения XXVII с'езда КПСС — в жизнь! Орган партийной и профсоюзной организаций».

✦ ✦ ✦

У Брэсце па ініцыятыве абласнога аддзялення Беларускага фонду культуры праведзен конкурс на праект помніка у гонар славутай перамогі нашых продкаў пад Грунвальдам. Пераможцам стаў мастак сп. Паўлючык. Яго праект — сімвалічная капліца, якая мае быць устаноўлена на тэрыторыі Берасцейскага замчышча, дзе некалі адбылася гістарычная сустрэча вялікага князя Вітаўта і караля Ягайлы, якія дамаўляліся адносна сумесных дзеянняў супраць крыжакоў.

✦ ✦ ✦

Выпіска са справаздачы, падпісанай Генеральным пракурорам В. Шаладонавым, Старшынёй Кантрольнай палаты В. Саковічам, Старшынёй Праўлення Нацыянальнага банка С. Багданкевічам, міністрам унутраных спраў В. Ягоравым, старшынёй КДБ Э. Шыркоўскім:

Дырэктар КБА г. Пружаны У. Д. Маўчун прадаў аўтамайстэрні, аўтатранспарт агульным коштам 1310 тыс. руб. акцыянернаму таварыству «Брэст—Лада»

Ад рэдкалегіі:

Як бачым, шырокае распаўсюджанне атрымаў продаж дзяржаўных вытворчых фондаў недзяржаўным структурам і фізічным асобам без дазволу ўласніка-дзяржавы і пры заніжанай ацэнцы іх кошту. Рэспубліка панесла страты ад падобнай незаконнай продажы 920 млн. руб. (праверана ўсяго больш паўтары тысячы прадпрыемстваў і ўстаноў). Вярхоўны Савет пра гэта даведаўся.

А што далей?

Аб дэпутацкай некампентэнтнасці і беспрынцыповасці

29 чэрвеня дэпутаты раённага Савета абсалютнай большасцю галасавалі за знішчэнне сада «Пляцбанцы» і перадачу гэтай надзвычай урадлівай зямлі індывідуальным забудоўшчыкам.

Такое рашэнне пярэчыць «Кодэксу Рэспублікі Беларусь аб зямлі» — артыкулы 16, 18, 61.

«Тэарэтычнае» абгрунтаванне забудовы ўрадлівай зямлі катэджамі далі на сесіі некампентэнтныя людзі, такія, як раённы архітэктар Чарняўскі і спецыяльна запрошаная сюды Лукуць. Сапраўды кампентэнтных спецыялістаў па садах на сесію, як заўсёды, запрасіць «забыліся».

Здзіўляцца ўсяму гэтаму няма чаго, бо большасць дэпутатаў раённага Савета — гэта начальнікі - наменклатуршчыкі, што і сёння знаходзяцца ў палоне бальшавіцкай ідэалогіі. Метады дзейнасці гэтых людзей таксама ранейшыя. Для іх «закон, як дышла, куды павярнуў, туды і выйшла.»

Камуністы — вялікія майстры знішчаць. Яны знішчалі «ворагаў народа», знішчалі - разбуралі храмы, помнікі гісторыі і культуры. Цяпер жа, будучы пры ўладзе, яны бяруцца за знішчэнне унікальнага сада.

ЧАРКАСАВА Г. І.
дэпутат раённага Савета.

Ці можна нашых народных дэпутатаў выбіраць на другі тэрмін?

Амаль тры гады змагалася ініцыятыўная група жыхароў горада і народных дэпутатаў за тое, каб перадаць прыгарадны 47-гектарны сад «Палябанцы» ў валоданне таму, хто яго стварыў — працоўнаму народу. Было паслана мноства пісьмаў у розныя інстанцыі, а ў артыкулах гаварылася аб адным: сад трэба зберагчы і аднавіць для наступных пакаленняў.

Трэба аддаць даніну павагі і падзякаваць тым народным дэпутатам, якія не глядзелі ў рот спадару Тарасевічу С. В., а цвёрда стаялі за тое, каб выратаваць унікальны сад (гл. артыкул у «Народнай газеце» № 79-81 ад 30.04.93 «Чтобы «вырастить» коттеджи, надо вырубить сады? . . .»

Вось імёны гэтых сапраўдных выбраннікаў працоўнага народа.

Народныя дэпутаты Пружанскага гарадскога Савета:

Басак А. В., Вакульчык В. М., Вакульскі М., А., Гаваруха А. А., Жорах П. І., Жаркоў А. І., Папеніс У. Ш., Сарока Г. А., Сарока М. А., Каральчук В. І., Лазарук В. А., Пятрашка Г. В., Чарніцкі У. А., Чык В. М., Хадаровіч Г. У., Хамідулін Г. Г., Шароў У. М.

Народныя дэпутаты раённага і абласнога Саветаў:

Губараў В. М., Зялевіч С. С., Мініціч У. М., Сапронаў У. М., Чаркасава Г. І., Сарока М. С.,

Калі б у дапамогу гэтай групе выступілі і працоўныя калектывы горада, то, напэўна, удалося б гараджанам выратаваць сад. Бо вельмі ж моцная група народных дэпутатаў выступіла за знішчэнне ўнікальнага сада. Так, 29 чэрвеня абсалютная большасць дэпутатаў райсавета (73 чал.) прагаласавала за гэта знішчэнне. А яе ж падтрымліваюць яшчэ тры «высокія» дэпутаты і палова дэпутатаў гарсавета! Таму і выступае такі аб'яднаны атрад «байцоў» за тое, каб сад знішчыць, а высокаўрадлівую зямлю

(працяг на другой старонцы)

Дэпутацкі запыт

25. 06. 93 года на сесіі гарадскога Савета народны дэпутат Жаркоў А. І. звярнуўся да старшыні раённага Савета з наступным запытам:

У 1987 годзе дырэктарам СШ № 3 быў прызначаны Іовік П. М., які спачатку працаваў у камсамоле, а пасля партыйным функцыянерам. Апошнія 22 гады — загадчыкам Пружанскага РАНА. Працуючы ў школе, ён праявіў сваю абыякавасць да справы і некампентэнтнасць, а ў адносінах з людзьмі — грубасць. Да гэтага часу школа нават не мае свайго статута. У выніку такога кіраўніцтва школа страціла ранейшыя свае дасягненні. З-за грубасці і хамства дырэктара многія настаўнікі перайшлі ў іншыя школы.

У бягучым годзе Іовіку П. М. споўнілася 60 год, і ён мае права на поўную пенсію.

Скажыце, паважаны старшыня раённага Савета, ці збіраецеся Вы трымаць на пасадзе дырэктара школы Іовіна П. М., які яўна не спраўляецца з ускладзенымі на яго абавязкамі?

ЖАРКОЎ А.
Дэпутат гарадскога Савета

Заканчэнне
(пачатак на першай старонцы)

сада аддаць пераважна багацеям з тоўстымі кашалькамі, каб гэтыя багацеі змаглі пабудаваць на месцы сада свае гмахі-катэджы, стварыць «Царскае Сяло-2». Вось імёны тых народных дэпутатаў, якія ў адкрытую альбо гуляючы ў маўчанку дапамагаюць знішчыць унікальны сад.

Народныя дэпутаты Пружанскага гарадскога савета

Вербанікоў А. В., Ганчаронка М. Я., Драч Н. Ф., Жуковіч А. С., Зверава В. І., Кананюк М. Г., Мармузевіч Г. А., Малайчук Я. С. Мікіцюк А. А., Мацянін А. А., Мінюк Н. А., Панічыц В. В., Панічыц І. Н., Сцепанюк В. В., Трэбнікаў Г. Н., Хоміч Л. Л., Шчэрба Я. В.

Народныя дэпутаты Пружанскага раённага савета

Аламніеў У. Н., Аніп Г. К. Астапчук У. І., Асадчук А. Н., Башкірцава А. Ф., Барысевіч Н. І., Білецкі П. М., Барысевіч М. У., Валошын У. У., Граб У. І., Галанейка У. І., Гайдук З. Я., Гардзейчык У. І., Герасцын В. І., Грыгорык А. А., Грыгорык В. А., Давідчык М. М., Даўгайла М. М., Дзевніцейчык С. В. Дземідовіч Л. М., Дзешка А. М., Журко Я. У., Замковіч Я. І., Зінчанка А. М. Іваноў Л. Ф., Кавалёў А. А., Лагуцін В. Я., Ліш П. М., Літвінчук Л. В. Лук'яновіч П. А., Мацкевіч Д. С., Маслёнкіна В. М., Мінюк П. М., Міхальчук Я. В., Міхаевіч І. І., Мязга І. А., Нікулышын В. Я., Навахацька У. В., Пачынчык І. М., Пажуй С. І., Петрань М. В., Плеска М. К., Раўнейка А. У., Рамаяоўская А. І., Разанка Г. Г., Самайлюк В. У., Сарока В. І., Сірэна М. У., Семянчук С. Д., Сёмуха А. У. Сіпітко В. М., Тарасевіч С. В., Каласей В. М., Казадой У. У., Калеснік У. В., Каннвалік М. В., Каўрыга В. М., Калак В. М., Клешнік А. Г., Кудзелька У. М. Куцько Г. І., Куталаў Я. Ф., Кудзінаў Я. І., Тарасюк Я. І., Тур У. М., Цубер У. Я., Цыпурка М. А., Шантаровіч В. А., Шалест У. А., Юдчыц Я. М., Юк У. У., Ярмолік А. І., Якута М. І.

Народныя дэпутаты абласнога і Вярхоўнага саветаў: Бурскі В. І., Вайцешык А. М., Сямашка І. І.

Вось такія нашы народныя выбраннікі, якіх мы выбралі самі і з якімі мы вымушаны разам жыць і працаваць.

Жыхары горада Пружаны: І. ХАДЗЯЕЎ, Т. КІРЭЕВА, М. ЛЫТНЕЎ.

Спыніць праследаванне патрыётаў Беларусі!

Спыніць праследаванне патрыётаў Беларусі!

Па віне нашых заходніх і ўсходніх суседзяў Беларусь больш чым дзвесце гадоў не мела свае дзяржавы, і вось нарэшце Бог злітаваўся над намі: распалася апошняя ў свеце імперыя — СССР. Беларусь аб'явіла сябе незалежнай, нейтральнай дзяржавай. Дабівацца поўнай незалежнасці — абавязак кожнага грамадзяніна Беларусі, бо толькі ў гэтым наш паратунак.

Аднак у апошні час пракамуністычныя антыбеларускія сілы паўсталі супраць незалежнасці і нейтралітэту Беларусі. Яны цягнуць нашу рэспубліку ў ваенны саюз, праследуюць беларусаў-патрыётаў у войску.

Міністэрства абароны, якое ўзначальвае наш зямляк Павел Казлоўскі, пачало праследаваць Згуртаванне беларускіх вайскоўцаў (БЗВ). Звольнены з войска падпалкоўнік Мікола Статкевіч — старшыня БЗВ. Замест таго каб падтрымліваць БЗВ і апірацца на яго пры стварэнні беларускага войска, весці рашучую барацьбу з раскраданнем вайсковай маёмасці, Міністэрства абароны пачало праследаванне беларускіх патрыётаў. І галоўную ролю ў гэтай ганебнай справе іграе сам міністр. Калі раней мы ганарыліся сваім земляком, які стаў міністрам, то цяпер расчараваны, нам сорамна за яго. Выказванні і дзеянні шаноўнага міністра наводзяць на думку, што ён страціў родную глебу пад нагамі і сляпа выконвае нечую злую волю, і атрымліваецца, што Міністэрства абароны не ўмацоўвае незалежнасць і нейтралітэт Беларусі, а падрывае яго.

Мы падтрымліваем «Зварот да грамадзян Беларусі.» («Не дамо расправіцца з патрыётамі Беларусі!»), пад якім 83 подпісы, у тым ліку 56 народных дэпутатаў Рэспублікі Беларусь. Сярод іх і подпіс нашага дэпутата Івана Сямашкі, Акрамя дэпутатаў, Зварот падпісалі Васіль Быкаў, кіраўнікі дэмакратычных партый, вядомыя вучоныя, дзеячы культуры.

Мы патрабуем неадкладна спыніць праследаванне БЗВ і аднавіць на рабоце падпалкоўніка Міколу Статкевіча!

Мы за нейтралітэт Беларусі! «Не» ваеннаму саюзу!

Лытнёў М., Здановіч І., Жагалава Т., Жытко К., Кашуба М., і яшчэ 52 подпісы.

Пенсіянер абласнога значэння

На «заслужаны адпачынак» быў адпраўлены на чэрвеньскай сесіі Берасцейскага абласнога савета намеснік старшыні выканкаму Андрэй Гурынчук. Ён набыў вядомасць дзякуючы актыўнай дзейнасці на пасадзе старшыні камісіі па эканоміцы і развіцці рынкавых адносінаў. Гэты спадар «чамусьці» вырашыў, што ў першую чаргу трэба перавесці на новыя формы гаспадарання менавіта свае сямейства. Дзеля гэтага сп. А. Гурынчук дапамог уладкавацца свайму 28-гадоваму сыну ў Берасцейскі цэнтр навукова-тэхнічнае інфармацыі на пасаду дырэктара. Там жа апынулася і нявестка. Пасля сюды з абласнога бюджэту не без садзеяння сп. А. Гурынчука было перакінута 2 млн. рублёў (гэта было ў 1991 годзе), якія малады дырэктар пусціў у свой бізнес.

Тым часам сам А. Гурынчук у канцы 1991 года стварыў беларуска-польскае прадпрыемства «Тэхэканомпрагрэс», дзе дырэктарам стаў ягоны зяць Мікалай Кубацін. Сямейны бізнес пашыраўся...

У Берасці спадзяюцца, што адстаўка А. Гурынчука дасць магчымасць высветліць некаторыя іншыя загадкавыя факты. Напрыклад, праваахоўныя органы выявілі ў аблвыканкаме цікавы дакумент, складзены на расейскай і польскай мовах. У ім ад імя аблвыканкаму была просьба спрыяць аднаму вядомаму ў Берасці бізнесмену, супраць якога вядзецца цяпер крымінальная справа.

Вялікі скандал наспявае і вакол клуба «Прагрэс» (былой сінагогі). Гэты будынак быў на балансе абласных структураў, аднак не з'яўляецца іхняй маёмасцю. Тым не менш ён стаў адзіным цалкам прыватызаваным будынкам у Берасці. І гэта не зважаючы на тое, што юдаісцкая грамада яшчэ да пачатку яго прыватызацыі патрабавала вярнуць сінагогу вернікам. У гэтай справе занадта шмат дзіўных момантаў. Стаміўшыся шукаць праўду, прадстаўнікі юдаісцкай грамады вырашылі звярнуцца па дапамогу да сусветнай супольнасці і міжнародных габрэйскіх арганізацыяў, каб яны паўплывалі на беларускіх чыноўнікаў у справе вяртання былой сінагогі. Міністр замежных спраў П. Краўчанка ўжо атрымлівае першыя водгукі...

Узважыўшы гэтыя ды іншыя факты, у аблвыканкаме, мабыць, зразумелі, што выратаваць сітуацыю з намеснікам старшыні ўжо немагчыма. Вось і вырашылі «папрасіць» сп. Гурынчука на «заслужаны» адпачынак «у сувязі з дасягненнем пенсійнага ўзросту».

Цікава, дзе цяпер усплыве імя А. Гурынчука, у якой камерцыйнай структуры?

Вінцэсь Верамянюк.

Перадрук з газеты «Свабода».

Ад рэдкалегіі: Мы спадзяемся, што гэты артыкул зацікавіць нашых чытачоў, бо ў свой час А. Гурынчук працаваў у Пружанах на пасадзе старшыні райвыканкама і пакінуў пасля сябе такі-сякі след. Працаваў ён пасля і сакратаром Брэсцкага райкама КПБ. Словам, наменклатурная асоба.

Пра размеркаванне кватэр у „чарнобыльскім" доме

Рашэннем сесіі раённага Савета па заяве дэпутата Чаркасавай Г. І. была ўтворана камісія па вывучэнню законнасці размеркавання кватэр у гэтак званым чарнобыльскім 64-кватэрным доме па вуліцы Інтэрнацыянальнай, 8.

Камісія ўстанавіла, што старшыня Пружанскага гарсавета Трэбнікаў Р. Н. выдаў ордэр на кватэру № 33 па фіктыўнаму дакументу. Дырэктару РВА ЖКГ Шопіку дасталася кватэра № 54 нягледзячы на тое, што яго ранейшая кватэра па санітарных нормах дазваляла на пражыванне ў ёй.

Былому старшыні калгаса «Ленінскі шлях» Тарасюку Я. М., які жыў у Роўбіцку, а зараз працуе ў райвыканкаме, выдзелена кватэра № 15. Вось як гэта адбывалася. Прывяду копію пісьма:

«Председателю Пружанского горисполкома тов. Требникову Г. Н.
Управление с/хоз. и продовольствия Пружанского райисполкома просит выделить 3-комнатную квартиру, построенную на долевом участии за средства колхоза «Путь Ленина» в 64-квартирном доме по улице интернациональная дом 8 Тарасюку Евгению Николаевичу.

Начальник управления сельского хозяйства и продовольствия
Подпись — Крац.

Председатель профкома
Подпись — Подгурский».

Дармавая кватэра за калгасныя грошы і без чаргі дасталася Тарасюку.

Кватэру № 50, якая пабудавана на сродкі Каапнарыхтпрама, засяліў супрацоўнік КДБ Сергель М. В. У замен абяцалі перадаць Каапнарыхтпраму кватэру другога свайго работніка, які пераехаў у Менск, але той прыпісаў сваю маці і кватэру не перадаў.

Кватэра № 7 аддадзена начальніку лінейна-тэхнічнага цэха сувязі раённага вузла сувязі за садзеянне у тэлефанізацыі. А было так. Начальнік упраўлення капітальнага будаўніцтва райвыканкама прасіў начальніка вузла сувязі аказаць садзеянне ў тэлефанізацыі аб'ектаў «чарнобыльскай тэматыкі». Той ставіць умову: абмяняць кватэру сувязістаў на лепшую ў чарнобыльскім доме. Дамовіліся. Потым было пісьмо з УКБа ў гарсавет, а старшыня яго выдае ордэр на кватэру № 7 начальніку лінейна-тэхнічнага цэха сувязі Мікіцюку А. А.

Кватэру № 57 выдалі Дзмітрук А. М. — работніцы фінансавага аддзела, адзінокай. Мела кватэру плошчай 13.5 м². На наш погляд, права на абмен кватэры не мела.

Узнікае пытанне, чаму так настырна і праз розныя камбінацыі многія, пераважна начальнікі розных рангаў, стараліся займець кватэру ў «чарнобыльскім» доме? А ўсё ў тым, што кватэры ў гэтым доме палепшанай планіроўкі. Мясцовыя ж улады як заўсёды, аказаліся не на вышыні, патуралі «сваім» людзям.

ЖАРКОЎ А. І.

дэпутат гарсавета, нам. старшыні камісіі па законнасці размеркавання кватэр у доме 64.

Калі ж у нас пачнецца сапраўдная зямельная рэформа?

Кожны год са значным спазненнем Савет Міністраў нашай Рэспублікі ў сваіх пастановах прымае дадатковыя меры па задавальненню патрэбнасці грамадзян у зямельных участках. І кожны год у гэтых пастановах гучаць адны і тыя ж дэкларацыі: «вызначыць патрэбнасць», «забяспечыць выдзяленне», «перадаць пад агароды», «аказваць дапамогу», «стварыць спецфонды зямлі», «праверыць выкананне» і г. д.

Мясцовыя ж улады не толькі не выконваюць пастановы і распараджэнні ўрада, але нават на самы Законы не звяртаюць увагі.

Вось прыклад надзелу зямлёй жыхароў горада Пружаны.

На працягу мая 1992 г. (праз год пасля увядзення ў дзеянне «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб зямлі»!) бліжэйшыя да горада чатыры гаспадаркі са спазненнем выдзелілі гарвыканкаму каля 200 га зямлі і толькі часова — на 5 год. Усіх жа заяў гараджан на зямельныя ўчасткі было больш 3000. Вось і знайшлі мясцовыя ўлады для сябе лёгкі выхад: выдзелілі на кожную сям'ю не паложаных па Закону 0,1 га, а толькі 0,06 га.

Адзначым, што амаль усе дэпутаты райсавета (а іх жа 75 чалавек!) нават не заікнуліся перад спадаром Тарасевічам — старшынёй райвыканкама — аб тым, што трэба было б аб'яднаць гараджан, жадаючых працаваць на зямлі, у агародніцкія таварыствы, заключыць з кожным таварыствам дагавор аб пастаянным карыстанні агульным зямельным участкам, і выдзеліць пры гэтым кожнаму ўдзельніку таварыства не менш 0,1 га зямлі.

Есць жа у нас нядрэнны «Кодэкс аб зямлі», ёсць і «Закон аб таварыствах» — што яшчэ трэба?

Ну, добра: не ўлічылі, не прадбачылі такі вялізны попыт на зямельныя ўчасткі. Але ж на памылках вучымся! Дык чаму ж тады на працягу 1992-93 г. г. амаль ніхто з дэпутатаў райсавета нават не падумаў аб тым, што колькасць сем'яў-пружанцаў, маючых патрэбу у зямлі, да 1994 г. дасягне 4000? І што трэба гораду прадаставіць дадаткова 400-500 га зямлі з улікам патрэбнасці ў ёй на перспектыву. Ды не забыць пры гэтым гарадскія пасёлкі Ружаны, Шарашова.

Але ж бяда ў тым, што у райсавеце не хочуць прымаць рашэнні на карысць працоўных і праводзіць гэтыя рашэнні ў жыццё.

Трэба ж прадаставіць для двух гарадоў-пасёлкаў нашага раёна каля 700 га зямлі. Для гэтага патрэбна адабраць ад кожнай гаспадаркі раёна каля аднаго працэнта зямель, аб'яднаць асобныя кавалкі у цэльныя зямельныя паясы, якія акружылі б нашы гарады—пасёлкі.

Каб гэта зрабіць, трэба правесці ўнутрыраённую зямельную рэформу, у кожнай гаспадарцы перамясціць граніцы землеваладання. Зразумела, гэта вельмі складаная работа. Але ж і «Кодэкс аб зямлі» сабатуецца ўжо на працягу больш двух гадоў, трэба ж калісьці брацца за сапраўдную зямельную рэформу, і не падменьваць яе рознымі адгаворкамі, бачнасцю дзеянняў і фіктыўнымі справаздачамі. А калі патрэбна, то і пачаць прымяненне «Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях». Гэта значыць, што на некаторых асоб можна і трэба накласці штрафы — і немалыя.

Але ж каму брацца за усё гэта, калі амаль усе дэпутаты райсавета — адданыя слугі наменклатуры: старшыні, дырэктары, члены праўленняў? І да лямпачкі ім усе нашы Законы, Пастановы і Распараджэнні! Вось і ў гэтым годзе выдзелілі зноў кожнай сям'і у часовае карыстанне 0,06 га — і ўсе клопаты!

А у раёне ж многа зямель, якія выкарыстоўваюцца вельмі дрэнна. Неабходна гэтыя землі прыблізіць к жыхарам гарадоў — пасёлкаў, бо такіх жыхароў на Пружаншчыне каля 40 тысяч — больш паловы насельніцтва раёна!

Трэба прадастаўляць зямлю гаражанам у пастаяннае карыстанне, а яшчэ лепш — у пастаяннае валоданне, а не на 5 гадоў, як гэта робяць зараз, ды яшчэ без усякага замацавання дагаварамі альбо дзяржаўнымі актамі.

І тады у хуткім часе адпадзе неабходнасць клянчыць падачкі за мяжой, заключаць дагавор аб калектыўнай бяспецы і звяртацца да іншых непапулярных мер. Атрымала б частковае вырашэнне і праблема бяспекі. Народ Беларусі можа і павінен добра жыць, па-гаспадарчу выкарыстоўваючы сваю зямлю.

І. ХАДЗЯЕЎ сакратар раённай арганізацыі БСП
У. ШАРОЎ — член БСП

Заснавальнікі: Пружанская рада Беларускага Народнага Фронту «Адраджэнне», Раённая рада Таварыства Беларускай Мовы.
Сябры Сялянскай партыі.
Сябры Фонду «Льва Сапегі.»
Рэдкалегія: Чаркасава Г. тэл. 2-33-51
Здановіч І. — 2-23-23
Хадзяеў І. — 2-23-97
Жытко К. — 2-31-38
Рачко В. — 2-13-15

БЯСПЛАТНА

Пружанская гарадская друкарня 1264—999/11.08.93.